НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

БЕЛАРУСЬ
ПРАЗ ПРЫЗМУ
РЭГІЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ

Чашніцкі край:

гісторыка-культурная спадчына рэгіёна



НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

**БЕЛАРУСЬ
ПРАЗ ПРЫЗМУ
РЭГІЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ**

Чашніцкі край:
гісторыка-культурная спадчына рэгіёна

Зборнік навуковых артыкулаў

Мінск
«Беларуская навука»
2026

pawet.net

УДК [94+908](476.5)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43
Ч-29

Серыя заснавана ў 2018 годзе

Укладальнік

кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. В. Бараноўскі

Рэдакцыйная калегія:

В. Л. Лакіза (галоўны рэдактар), А. В. Бараноўскі (адказны рэдактар),
Л. У. Глушыцкі, А. Б. Доўнар, І. Л. Капылоў, Г. А. Крумплеўская, С. А. Траццяк

Рэцэнзенты:

кандыдат гістарычных навук, дацэнт П. А. Трубчык,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. В. Сумко

Зборнік падрыхтаваны ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2026–2030 гг. «Сацыяльна-эканамічная, палітычная і нацыянальна-культурная бяспека беларускай дзяржаўнасці» (навуковы кіраўнік – акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя) падпраграмы № 1 «Гісторыя» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. Л. Лакіза)

Чашніцкі край : гісторыка-культурная спадчына рэгіёна : зб. на-
Ч-29 вук. арт. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі ; уклад. А. В. Бараноўскі ; рэдкал.: В. Л. Лакіза (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2026. – 511 с. – (Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі).

ISBN 978-985-08-3400-3.

Зборнік навуковых артыкулаў уключае матэрыялы, прысвечаныя праблемам палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай і культурнай гісторыі Чашніччыны, якія прайшлі апрабацыю на навукова-практычнай канферэнцыі «Чашніцкі край: гісторыка-культурная спадчына рэгіёна», што адбылася ў чэрвені 2025 г. у г. Чашнікі Віцебскай вобласці.

Разлічаны на вучоных, студэнтаў, настаўнікаў, краязнаўцаў і ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з меркаваннем рэдкалегіі.

УДК [94+908](476.5)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43

ISBN 978-985-08-3400-3

© ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2026
© Афармленне. Выдавецкі дом
«Беларуская навука», 2026

ЗМЕСТ

Ад укладальніка 4

Приветственное слово председателя Чашникского районного исполнительного комитета **Александра Петровича Быкова** 11

Прывітальнае слова дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі **Вадзіма Леанідавіча Лакізы** 12

Прывітальнае слова дырэктара Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі **Ігара Лявонавіча Капылова** 14

ЧАШНІЧЧЫНА АД СТАРАЖЫТНАСЦІ ДА 1917 ГОДА

Павел Кенька, Аляксандр Вашанаў, Максім Чарняўскі *(Мінск).* Матэрыялы шматслойнага паселішча Чорная Лаза па выніках даследаванняў 2006–2008 гг. 16

Вольга Мядзведзева, Кірыл Мядзведзеў *(Мінск).* Вывучэнне археалагічнай спадчыны Чашніцкага рэгіёна (XVI–XXI стст.) 33

Дзяніс Юрчак *(Віцебск).* Вынікі інвентарызацыі помнікаў археалогіі Чашніцкага раёна 49

Наталья Шарковская (*Витебск*). «Чашникские материалы» в научном архиве и археологическом собрании Витебского областного краеведческого музея 58

Алег Дзярновіч *(Мінск).* Палеміка крыніц: абставіны бітвы на рацэ Уле 1564 г. паводле наратыўных помнікаў другой паловы XVI – пачатку XVII ст. 71

Марат Клімаў *(Мінск).* Археалагічныя і ландшафтна-кліматычныя падставы для лакалізацыі бітвы пад Улай 84

Ірына Багдановіч *(Мінск).* «На чашніцкім полі…»: мастацкае асэнсаванне бітвы на рацэ Уле 1564 г. у літаратурных творах XVI і XX стст. 98

Валерый Паздняков *(Мінск).* Уладальнікі Чашнікаў XVII ст. 109

Аляксандр Доўнар *(Мінск).* Прывілей на кірмашы Чашнікам 1782 г. 116

Дмитрий Фельдман *(Москва).* Страница истории белорусских евреев конца XVIII – начала XIX в.: к событиям в еврейской общине местечка Чашники 123

Лариса Митьковец *(Чашники).* Легенды и тайны Троицкой церкви 129

Віктар Грыбко *(Чашніцкі раён).* Род Валадковічаў у гісторыі Чашніччыны і Іванска 134

Аляксандр Ерашэвіч *(Мінск).* Чашніцкія баі 1812 г. 148

Алена Сакольчык *(Мінск).* Зямельныя спрэчкі Чашніцкага касцёла з мясцовымі жыхарамі (50–60-я гады XIX ст.) 159

Вадзім Урублеўскі *(Мінск).* Асаблівасці генеалагічнага і антрапанімічнага даследавання па Чашніцкім рэгіёне (на падставе крыніц другой паловы XVIII – першай паловы XX ст.) 172

Канстанцін Карпекін *(Віцебск).* Іўдзейскія малітоўныя будынкі Чашніцкага рэгіёна ў 1850–1930-я гг. 182

Валянціна Віталёва *(Мінск).* Гістарычны агляд горада Чашнікі 196

ЧАШНІЦКІ КРАЙ АД 1917 ГОДА ДА СУЧАСНАСЦІ

Алена Дашкевіч *(Мінск).* Дзейнасць мясцовых органаў улады Чашніччыны ва ўмовах польска-савецкай вайны (1919–1921 гг.) 202

Аляксандр Бараноўскі *(Мінск).* Тэрытарыяльнае ўладкаванне Чашніччыны (1919–1924 гг.) 207

Ала Арлова *(Бешанковіцкі раён).* Па старонках гісторыі пачатковых школ Копцевіцкай воласці Лепельскага павета 211

Антон Юпатов *(Витебск).* Чашникская вольно-пожарная дружина (начало 1920-х гг.) 219

Светлана Мясоедова *(Витебск).* Черейский район в социально-экономическом и статистическом отношениях (1924–1931 гг.) 226

Вольга Бароўская *(Мінск).* Удзел прадстаўнікоў Віцебскага і Аршанскага акруговых камітэтаў у выбарах дэлегатаў на I з'езд палякаў (1927–1929 гг.) 234

Сяргей Сергачоў *(Мінск).* «Гаспадарчае ўладкаванне» мястэчка Чашнікі ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. 239

Федор Шкирандо *(Витебск).* Развитие школьной системы образования Чашникского района в 1924–1941 гг. 246

Юлия Киселёва *(Витебск).* Чашникская бумажная фабрика «Красная Звезда» («Скина») 257

Аляксандр Субоцін *(Віцебск).* Стаханаўскі рух у Чашніцкім раёне ў другой палове 1930-х гг. 266

Андрей Барановский *(Минск).* Военный городок Разъезд 116 км Белорусского военного округа (2-я половина 1930-х гг.): забытые страницы истории 273

Алеся Богданова *(Витебск).* Тактические военные учения «борьба с парашютным десантом противника» по Чашникскому району в 1941 г. 284

Виталий Гарматный *(Минск).* Деятельность разведки Чашникской партизанской бригады «Дубова» на Витебщине в период Великой Отечественной войны 286

Ирина Бочкова *(Чашники).* Чашникский район: от оккупации до освобождения 297

Елена Бондарева *(Витебск).* Злодеяния немецко-фашистских захватчиков на территории Чашникского района: свидетельствуют документы 303

Кристина Богуш *(Витебск).* События Великой Отечественной войны глазами очевидцев 308

Сяргей Сергачоў *(Мінск).* Аграгарад Лукомль: няздзейснены праект 1950 г. 311

Станислав Леоненко *(Бешенковичи).* Материалы о Чашниччине на страницах Бешенковичской районной газеты «Зара» за 1962–1964 гг. 318

Елена Третьяк *(Дзержинск).* Строительство Лукомльской ГРЭС в 1960-х гг. в фото- и кинодокументах Белорусского государственного архива кинофотофонодокументов 323

Ганна Крумплеўская *(Мінск).* Адлюстраванне рэлігійнага жыцця насельніцтва Чашніцкага раёна ў другой палове XX ст. на старонках раённых перыядычных выданняў 329

ЗВЯЗАНЫЯ ЛЁСАМ З ЧАШНІЧЧЫНАЙ

Татьяна Иванова *(Витебск).* Общественно-политические взгляды и деятельность Василия Тяпинского 335

Раіса Аўчыннікава *(Мінск).* Лёс ураджэнца Чашнікаў біёлага Івана Фёдаравіча Аўчыннікава 345

Канстанцін Гайдукоў *(Віцебскі раён).* Георгіеўскія кавалеры Чашніцкага раёна: ураджэнцы і жыхары 347

Вольга Забродская *(Мінск).* Творы Янкі Журбы для дзяцей 357

Евгений Комар *(Минск).* Защитники родной земли 360

Мікалай Піявар *(Віцебск).* Краязнаўцы Чашніччыны – даследчыкі роднага краю 364

Ігар Шаладонаў *(Мінск).* Мастацкае адлюстраванне ахвярнасці і подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў аповесці А. Шашкова «Навальніца спее ў цішыні» 376

Ала Баранава (*Мінск*). Выхаваўчы патэнцыял апавяданняў Алеся Шашкова 383

Андрэй Ціхаміраў *(Гродна).* Роза Барысаўна Фейгіна. Старонкі жыцця 392

Аляксандр Бараноўскі *(Мінск),* **Антон Юпатаў** (*Віцебск*). Яны кіравалі Чашніччынай 402

Татьяна Буевич *(Витебск).* Чашникский район в лицах (1939–1941 гг.): краткий обзор биографий руководителей районного звена 404

Максим Олефиренко *(Витебск).* Зиновий Юрьев: советский писатель из Чашников 414

Александр Дубовик *(Минск).* Выпускники и ученые БПИ-БГПА-БНТУ, связанные с Чашникским районом 417

КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ЧАШНІЦКАГА КРАЮ

Мікалай Піявар *(Віцебск).* Сядзібы Чашніцкага краю 427

Ігар Капылоў *(Мінск).* Прозвішчы жыхароў Чашніцкага раёна як важная частка гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёна 439

Тамара Хадасевіч *(Чашніцкі раён)* «Зямля мая, ты для мяне – як дзіва!..»: тапонімы малой радзімы 456

Вольга Радзюль *(Віцебск).* Адлюстраванне культурна-гістарычных і прыродных адметнасцей рэгіёна ў мікратапаніміі Чашніччыны 476

Міхаіл Міхайлец *(Мінск)* Сучасны стан і праблемы захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны Чашніцкага раёна 481

Таццяна Валодзіна (*Мінск*). Каляндарны абрад «Розгары» з аграгарадка Лукомль Чашніцкага раёна на агульнаэтнічным фоне 489

Яна Шаўчэнка *(Мінск).* Дзікарослы раслінны свет у штодзённасці насельніцтва Чашніцкага раёна другой паловы XX ст. (паводле матэрыялаў раённага перыядычнага друку) 500

Звесткі аб аўтарах 505

Окончание таблицы

№ п/п описи ф. 9, д. 3	№ инвентарной описи музея Федоровича	Название и описание предметов; размеры; история предмета; сохранность	Примечания	Учетный номер ВОКМ
		серед<ина> – 3½; толщ<ина>: у обуха – 3½ см, у острия – 4¼ см; судя по надписи, из собрания Володковича		
157	№ 89	Маленький изящный топорик со сверлиной 2 см в диам<етре> (от обуха 1½, от острия 2¼); дл<ина> – 6 см; ш<ирина> – 1–3 см; толщ<ина> – 3–5 см; судя по надписи, из собрания Володковича; хорошее	Надпись красной краской W 10	ВОКМ КП 629

* ***Примечание:*** столбцы 1, 2, 3 и 4 даются по описи, составленной В. Г. Краснянским в середине 1920-х гг. (ВОКМ. Научный архив. Ф. 9. Д. 1. С. 74–75, 76–77, 78–79). Пропущенные слова и буквы восстановлены в угловых скобках. Размеры обозначены в сантиметрах – «см». В столбце 5 указан современный учетный номер ВОКМ выявленного предмета.

Алег Дзярновіч *(Мінск)*

ПАЛЕМІКА КРЫНІЦ: АБСТАВІНЫ БІТВЫ НА РАЦЭ УЛЕ 1564 г. ПАВОДЛЕ НАРАТЫЎНЫХ ПОМНІКАЎ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVI – ПАЧАТКУ XVII ст.

Бітва на Уле (1564): гістарычная падзея і яе кантэкст

Бітва на Уле стала адной з самых значных падзей ва ўсёй Лівонскай (Інфлянцкай) вайне 1558–1583 гг., асабліва яе этапу 1558–1570 гг. Ёй папярэднічалі сапраўды драматычныя падзеі – за год да бітвы, 15 лютага 1563 г., расійскімі войскамі быў узяты Полацк, што вяло да змены балансу ў вайне.

Але абодвум бакам было патрэбна перамір'е, каб згрупаваць сілы і падрыхтавацца да новай кампаніі. На працягу снежня 1563 – студзеня 1564 г. у Маскве знаходзілася пасольства ВКЛ на чале з крайчым Юрыем Хадкевічам. Дыстанцыя ў пазіцыі бакоў была вельмі вялікая: тычылася гэта як тэрытарыяльных пытанняў, так і праблемы прызнання царскага тытула Івана IV[1]. Падобна, што абодва бакі ўскладалі на гэтыя перамовы спадзяванні

[1] Пра абставіны перамоў гл.: Сборник Императорского Русского исторического общества. [Т. 6]. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством. Т. 3, (1560–1571 гг.) / изданы под редакцией [и с предисловием] Г. Ф. Карпова. [8], V, 807, 234, [5] с. (Сборник Императорского Русского исторического общества ; т. 71). С. 189–285; *Хорошкевич А. Л.* Россия в системе международных отношений середины XVI в. М. : Древлехранилище, 2003. С. 366–389.

атрымаць менавіта тактычную перадышку: дэлегацыя ВКЛ прапаноўвала заключыць перамір'е толькі да лета 1564 г.; расійскі бок высоўваў тэрытарыяльныя патрабаванні. Далейшыя падзеі пацвердзілі гэта: як толькі перамовы безвынікова спыніліся, дзве розныя групоўкі расійскіх войскаў вырушылі ў паход.

З Полацка на поўдзень скіравалася войска на чале з новапрызначаным полацкім ваяводам і ўдачлівым да гэтага палкаводцам князем Пятром Шуйскім. У Смаленску ж была сфарміравана групоўка пад камандаваннем князёў Васіля і Пятра Сярэбраных-Абаленскіх, якая мусіла выступіць з Вязьмы ды ісці на злучэнне з Шуйскім пад Оршай. У Дадатку да Ніканаўскага летапісу (спісы Сінадальны і Аляксандра-Неўскі)[1], створаным якраз у перыяд Лівонскай вайны, манеўр войскаў акрэсліваўся наступным чынам: *«...а отъ Орши итти къ Мѣньску и къ Новугородку къ Литовскому воевати...»*[2] У так званым «Лісце аб навінах» невядомага літвіна – непрыяцельскае войска *«мело ити до Друцкиъ поль черезъ панство его королевской милости, чынячи плѣнъ и шкоду»*[3]. Як «спусташальны рэйд» ацэньваюць гэтую выправу расійскія гісторыкі А. Філюшкін і А. Кузьмін[4]. Зрэшты, войны ў познім Сярэднявеччы і раннім Новым часе якраз вызначаліся стратэгіяй па падрыве дэмаграфічнага і матэрыяльнага патэнцыялу праціўніка.

Вакол бітвы 1564 г. на Уле ўжо склалася свая гістарыяграфія, і сярод праблем, якія дыскутуюцца, можна вылучыць наступныя тры:

1) колькасць удзельнікаў бітвы з абодвух бакоў;

2) спецыфіка працэсу бітвы;

3) тактычныя і стратэгічныя наступствы бітвы.

Колькасць войскаў

Эпісталярныя крыніцы

Паводле звестак вялікага гетмана ВКЛ Мікалая Радзівіла Рудога, войска Шуйскага вырушыла з Полацка 23 студзеня 1564 г. Са сваім войскам Мікалай Радзівіл Руды і польны гетман Рыгор Хадкевіч знаходзіліся ў Лукомлі. Спрэчкі пра колькасны склад войскаў абодвух бакоў ва ўмовах адсутнасці непасрэднай статыстыкі заслугоўваюць асобнага аналізу.

---

[1] Летописный сборник, именуемый Патриаршей или Никоновской летописью : продолжение / предисл. Б. М. Клосса. [Репр. воспр.]. М. : Яз. рус. культуры, Кошелев, 2000. С. V. (Полное собрание русских летописей ; т. 13).

[2] Там же. С. 377.

[3] Вестовая отписка неизвестного Литвина о поражении Московского войска под Улою и Дубровною. 11 февраля 1564 // Витебская старина / сост. А. Сапунов. Т. 4, ч. 1 : Полоцкое воеводство под властью царя Иоанна Васильевича Грозного (1563–1580). Витебск, 1885. С. 84.

[4] *Филюшкин А. И. Кузьмин А. В.* Когда Полоцк был российским. Полоцкая кампания Ивана Грозного 1563–1579 гг. М. : Русские Витязи, 2017. С. 49.

У першую чаргу тут варта прыгадаць дыскусію пра колькасць войскаў бакоў (табл. 1), што ўдзельнічалі ў бітве[1]. Непасрэдна пасля бітвы, 27 студзеня 1564 г., Мікалай Радзівіл Руды пісаў пра 18–20 тыс. чалавек у грунпоўцы Шуйскага[2]. Вялікі гетман указваў таксама колькасць страт у маскоўскім войску – «каля 9 або 10 тысяч». Ліст Мікалая Радзівіла Рудога быў найбольш інфармацыйны ў перадачы дэталяў бітвы. Ліст польнага гетмана Рыгора Хадкевіча да Габрыэля Тарла з Пацеевічаў, які быў напісаны літаральна праз два дні пасля ліста Радзівіла – 29 студзеня 1564 г., вельмі сціслы на дэталі. Але Хадкевіч паведамляе важную акалічнасць, якая спрычынілася да абмежаванай колькасці войска ВКЛ пад яго камандай, – войска ВКЛ было падзелена на тры часткі, а польскага войска ў той час не было («belo na troie rozłączone… woisko tesz polskie nie bylo przy nas»)[3].

Захаваўся змест ліста яшчэ аднаго сведкі падзеяў на Уле. Біскуп і будучы кардынал Джавані Франчэска Камендоне (Giovanni Francesco Commendone), які з кастрычніка 1563 па снежань 1565 г. быў папскім нунцыем пры двары Жыгімонта Аўгуста, вёў сталае ліставанне з кардыналам і арцыбіскупам Мілана Карла Барамеем (Carlo Borromeo). Да свайго паслання з Варшавы ад 4 лютага 1564 г.[4] нунцый далучыў ліст ананімнага ўдзельніка Ульскай бітвы[5]. Камендоне акрэсліваў колькасць войск ВКЛ у 6000, але ўказваў, што перамога была атрымана з удзелам толькі часткі войска. З кантэксту ліста вынікае, што гэтыя даныя былі прыведзены ў лісце ваяводы троцкага і вялікага гетмана Мікалая Радзівіла Рудога. Нунцый пазначае таксама лічбы страт войска ВКЛ – 22 чалавекі загінулі і 700 былі паранены. Крыніцай гэтых звестак стаў ліст удзельніка бітвы, які пісаў пра на здзіў-

---

[1] Гл. агляд звестак крыніц: *Янушкевіч А. М.* Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. Мн. : Медысонт, 2007. С. 76–78; *Янушкевич А. Н.* Ливонская война 1558–1570 гг. и Великое княжество Литовское. Мн. : Медисонт, 2013. С. 82–83.

[2] Российская национальная библиотека. Отдел рукописей (РНБ ОР). Ф. 971 («Собрание автографов П. П. Дубровского»). Оп. 2, д. 234. № 1; Копия с письма, присланного литовским гетманом в Варшаву на имя пана Радивила, с известием об одержанной им победе в сражении с москвитянами, и о том, какая богатая добыча досталась его литовской рати, 26-го января, сего 1564 года // Чтения в императорском обществе истории и древностей Российских. М., 1847. № 3. С. 2.

[3] Litterae Gregorii Chodkiewicz de victoria de Mascis in campis inter Orsza et Druck reportata // Elementa ad fontium editiones / ed. Carolina Lanckorońska. Romae : Institutum Historicum Polonicum Romae, 1978. T. XLIII : Documenta ex Archivo Regiomontano ad Poloniam spectantia, XIII pars, HBA, B2a, 1534–1565. P. 201–203.

[4] Pamiętniki o dawnéj Polsce z czasów Zygmunta Augusta obejmujące listy Jana Franciszka Commendoni do Karola Borromeusza ; z Biblioteki Barberińskiej / zebrał Jan Albertrandi ; z rękopisów wł. i łac. wytł. Józef Krzeczkowski ; Wiadomość o życiu Commendoni'ego tudzież potrzebne sprostowania i objaśnienia dodał Mikołaj Malinowski. Wilno : R. Rafałowicz, 1851. T. 1. S. 45–46.

[5] Ibid. S. 46–50.

ленне малую колькасць ахвяр у літвінскім войску: «a co najdziwniejsza, że naszych zaledwo dwódziestu zginęło, ranionych prawie siedmiuset»[1].

Што тычыцца колькасці маскоўскага войска, у лісце нунцыя адбылася яўная блытаніна. Спачатку Камендоне паведамляў, што князь Шуйскі выйшаў з Полацка, маючы 8000 войска, але ніжэй адзначаў, што страты праціўніка склалі каля 9000 («około dziewięciu tysięcy trupem położono»)[2]. У дадзеным лісце ананімнага ўдзельніка бітвы сцвярджаецца, што страты маскоўскага войска дасягнулі 10 000 («Legło w tej bitwie, jak twierdzą, na 10 t. bojowego ludu»)[3].

Табліца 1. **Колькасць войскаў у бітве на Уле 1564 г. паводле эпісталярных крыніц другой паловы XVI ст.**

Аўтар і від паведамлення	Дата паведамлення (публікацыі)	Войска Расійскай дзяржавы	Войска ВКЛ
Мікалай Радзівіл Руды, ліст[4]	1564, 27 студзеня	18 000–20 000 чалавек (паводле інфармацыі палонных – больш за 30 000) (загінулі 9000–10 000: «około 9 albo 10 tysięc Moskwy legło»)	Загінула не больш за 20 чалавек, паранена 600–700
Рыгор Хадкевіч[5]	1564, 29 студзеня	–	Войска ВКЛ было зменшана праз падзел, яшчэ да бітвы, на тры часткі
Джавані Франчэска Камендоне[6]	1564, 4 лютага	8000 чалавек, але страты склалі каля 9000 («około dziewięciu tysięcy trupem położono»)	Усё войска 6000 чалавек (удзельнічала ў бітве частка войска); страты: 22 чалавекі загінулі, 700 – паранены
Ананімны ўдзельнік бітвы[7]	1564, 4 лютага	Страты – 10 000 чалавек	Малая частка кавалерыі

Творы гістарыяпісання

Эпісталярная карэспандэнцыя датуецца цалкам блізкім да дня бітвы часам. Даволі хутка, меркавана праз 10 гадоў, пачала паўставаць хранікарная традыцыя апісання бітвы на Уле.

Ужо Мацей Стрыйкоўскі, як вынікае з поўнай назвы яго паэмы, што атрымала гістарыяграфічную назву «Бітва на Уле», першапачаткова вызна-

[1] Pamiętniki o dawnéj Polsce. S. 49.

[2] Ibid. S. 46.

[3] Ibid. S. 49.

[4] РНБ ОР. Ф. 971. Оп. 2, д. 234. № 1; Копия с письма, присланного литовским гетманом в Варшаву на имя пана Радивила. С. 2.

[5] Litterae Gregorii Chodkiewicz. P. 201–203.

[6] Pamiętniki o dawnéj Polsce. S. 46.

[7] Ibid. S. 46–50.

чаў гэту колькасць у 30 тыс. чалавек: «Wiersz o Porazeniu 30000 Moskwy z Kniaziem Piotrem Szoiskim Woiewodą Poloczkim w Poliu Iwanskim nad Ulą rzeka, za sprawą y rządzeniem Iasnie Wielmożnego Pana, Pana Mikolaia Radziwila na Bierzach y Dubingach Xiązeczia, Hetmana Naiwysze[go] woisk W° X^wa Litt°, ze y za przewąznym z dokazowaniem Iasniewielmoznego Pana, Pana Hrehora Chodkiewicza, Pana Wilenskiego y Polnych Woisk Hetmana Czuynego, Roku od Zbawionne Narodzenia Chr[ist]usa Pana 1564 January»[1].

Але ўжо ў сваёй «Хроніцы польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі» адпаведнаму раздзелу Стрыйкоўскі даў назву *«Аб паражэнні 25 000 масквіцінаў на Уле»*[2]. Але, магчыма, супярэчнасцей у Стрыйкоўскага няма. Непасрэдна ў тэксце «Хронікі» аўтар паведамляе, што *«Масквы 25 000 было разгромленых і пабітых, так што да Полацка ледзь 5000 збегла, і тое параненых, бо ў пагоні цэлую ноч, калі месяц свяціў, і потым у розных месцах тых, хто туляўся, вельмі многіх сяляне і казакі пабілі»*[3]. Складванне гэтых лічбаў і магло даць 30 000 маскоўскага войска – у такім разе Стрыйкоўскі застаўся верным сваёй версіі колькасці праціўніка.

Відавочна, пад уплывам звестак М. Стрыйкоўскага знаходзіўся генеалог і геральдыст Барташ Папроцкі. У 1584 г., праз два гады пасля выхаду ў свет «Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі» Стрыйкоўскага, Папроцкі апублікаваў свой «Гербоўнік рыцарства польскага»[4], у якім вызначаў колькасць маскоўскага войска ў 25 000, а войска ВКЛ – «толькі чатыры тысячы чалавек»[5].

Польскую хранікарную традыцыю апісання бітвы на Уле працягнуў Марцін Бельскі, аўтар маштабнай гістарычнай панарамы «Хроніка ўсяго свету», трэцяя аўтарская рэдакцыя якой выйшла ў 1564 г.[6] і не змяшчала звестак пра бітву на Уле. Гістарыёграф працаваў над чацвёртай рэдакцыяй хронікі, але не паспеў яе скончыць з-за сваёй смерці ў 1575 г. Справу Марціна Бельскага працягнуў яго сын Іахім, які ў 1597 г. выдаў пад тытулам

---

[1] Пушкинский Дом (Санкт-Петербург). Древлехранилище. Коллекция Онацевича. X, 33 («Зборнік Стрыйкоўскага»). Арк. 8.

[2] *Stryjkowski M.* Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiéj Rusi. Warszawa, 1846. T. II. S. 414.

[3] «Moskwy 25.000 było rozgromionych i pobitych, tak iż do Połocka ledwo 5000 ubiegło i to rannych, bo i w pogoni przez całą noc gdy miesiąc świecił i potym w różnych miescach tulających się bardzo wiele chłopi i Kozacy pobili" (Stryjkowski M. Kronika polska... S. 415).

[4] *Paprocki B.* Herby rycerstwa polskiego na pięcioro ksiąg rozdzielone. Kraków : W drukarni Macieja Garwolczyka, 1584.

[5] *Paprocki B.* Herby rycerstwa polskiego przez Bartosza Paprockiego zebrane i wydane r. p. 1584 / wyd. K. J. Turowski. Kraków : Biblioteka Polska, 1858. S. 854.

[6] *Bielski M.* Kronika tho iest historya swiata na sześć wiekow, a cztery monarchie, rozdzielona z rozmaitych historykow, tak w swiętym pismie krześćiańskim zydowskim, iako y pogańskim, wybierana y na polski ięzyk wypisana dosthatheczney niż pierwey, s przydanim wiele rzeczy nowych: od początku swiata, aż do tego roku, ktory sie pisze 1564, s figurami ochędożnymi y własnymi. Kraków : W Drukarni Mateusza Siebeneichera, 1564.

«Хроніка польская»[1] перапрацаваную і дапоўненую да 1586 г. версію «Хронікі ўсяго свету». Паводле І. Бельскага, войска П. Шуйскага мела 30 000 чалавек: «Moskiewski dowiedziawszy sie tego zebrał znowii jeszcze wieksze wojsko, które wyprawił z Piotrem Serebrnym i z carzewicem kazańskim do Litwy; mieli ci dwa piećdziesiat tysięcy a Sojski trzydzieści tysięcy»[2]. Страты ж маскоўскага войска храніст ацэньвае да 20 000: «...wszystkiej Moskwy zginęło do dwudziestu tysięcy, a ostatek do Polocka ledwie ubiegło» [3]. Войска ж ВКЛ у «Хроніцы польскай» налічвала да 10 000 жаўнераў, «годных да бітвы»: «Mikołaj Radziwiłł książę na Olice hetman litewski ruszył się prze ciwko niemu z Hreorem Chotkiewiezem; mieli oba do dziesiąci tysiecy ludzi do boju godnych»[4].

Рэнесансны аўтар і палітычны каментатар Лукаш Гурніцкі паміж 1595 і 1603 гг. напісаў сваю апошнюю вялікую працу «Гісторыя Кароны Польскай... ад году 1538 аж да году 1572», якую ў 1637 г. апублікавалі ўжо сыны аўтара[5]. Гурніцкі ў цэлым застаўся верным ацэнкам страт маскоўскага войска, якія ўжо склаліся ў гісторыяпісанні Рэчы Паспалітай – каля 18 000 чалавек, апроч тых, што загінулі пры ўцёках: «Poległo wtenczas Moskwy blisko ośminastu tysięcy i nadto w pogoni siła ich zginęło»[6] (табл. 2).

Табліца 2. **Колькасць войскаў у бітве на Уле 1564 г. паводле наратыўных крыніц другой паловы XVI – пачатку XVII ст.**

Аўтар і від паведамлення	Дата паведамлення (публікацыі)	Войска Расійскай дзяржавы	Войска ВКЛ
Мацей Стрыйкоўскі, паэма «Бітва на Уле»[7]	1574–1575	30 000 чалавек (16 000 палеглі)	«Ледзьва 8 тысяч» («ledwe ośm tysiącz»
Аляксандр Гваньіні, «Хроніка еўрапейскай Сарматыі»[8]	(1578, 1611)	30 000 чалавек загінулі («quorum triginta millia occisa esse compertumest»/ «Zginęło tam na ten czas Moskwy trzydzieści tysięcy»)	«Малое войска» («parva manu»/«z małym woyskiem»)

[1] *Bielski J.* Kronika polska Marcina Bielskiego. Nowo przez Joach[ima] Bielskiego syna iego wydana. Kraków : W drukarni Jakuba Sibeneychera, 1597.

[2] *Bielski M.* Kronika polska Marcina Bielskiego / wyd. K. J. Turowski. Sanok : nakład i druk Karola Pollaka, 1856. T. II, księga IV, V. S. 1153.

[3] Ibid. S. 1153.

[4] Ibid. 153.

[5] *Górnicki Ł.* Dzieie w Koronie Polskiey z przytoczeniem niektorych postronnych rzeczy: od Roku 1538 áż do Roku 1572. Kraków : W drukarni Andrzeja Piotrkowczyka, 1637.

[6] *Górnicki Ł.* Dzieje w Koronie Polskiej / oprac. H. Barycz. Wrocław : Wydawn. Zakładu Narodowego im. Ossolińskich, 1950. S. 130.

[7] Пушкинский Дом. Коллекция Онацевича. X, 33 («Зборнік Стрыйкоўскага»). Арк. 8.

[8] *Guagnini A.* Sarmatiae Europeae descriptio, quae regnum Poloniae, Lituaniam, Samogitiam, Russiam, Masoviam, Prussiam, Pomeraniam, Livoniam, & Moschoviae, Tartariaeque partem complectitur. [Kraków] : Maciej Wirzbięta, 1578. Fol. 43v.; *Gwagnini A.* Kronika Sármácyey Europskiey : W Ktorey Sie Zamyka krolestwo Polskie [...] tudzież też Wielkie Xięstwo Lithew., Ruskie, Pruskie, Zmudzkie, Inflantskie, Moskiewskie y część Tatarow [...]. Kraków : W drukarni Mikołaja Loba, 1611. S. 127.

Заканчэнне табл. 2

Аўтар і від паведамлення	Дата паведамлення (публікацыі)	Войска Расійскай дзяржавы	Войска ВКЛ
Мацей Стрыйкоўскі, «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсёй Русі»[7]	1582	25 000 чалавек (5000 уратаваліся)	«Не больш за 4 тысячы» («do boju godnego o cztery tysiące»)
Барташ Папроцкі «Гербоўнік рыцарства польскага»[8]	1584	25 000 чалавек	4000 чалавек
Марцін і Іахім Бельскія «Хроніка польская»[9]	1597	30 000 чалавек (страты да 20 000)	Да 10 000 чалавек
Лукаш Гурніцкі «Гісторыя Кароны Польскай»[10]	1637 (1595–1603)	(Страты – каля 18 000 чалавек, апроч тых, што загінулі пры ўцёках)	–

Аналізуючы колькасныя выкладкі, варта адзначыць, што з расійскага боку асобныя аддзелы ўзначальвалі прадстаўнікі Баярскай Думы і татарскія царэвічы[5]. Але тут трэба зрабіць адно важнае ўдакладненне – у бітве пад Улай сышліся не поўнамаштабныя вайсковыя сілы дзвюх дзяржаў, а толькі аператыўныя групоўкі, якія былі сфарміраваны на той момант. Для ВКЛ мабілізацыя вайсковага патэнцыялу гэтага этапу Інфлянцкай вайны адбывалася ў сітуацыі, калі стала зразумелай неэфектыўнасць ранейшай формы арганізацыі войска – паспалітага рушэння. Бітвы выйграваліся ўжо прафесійным наёмным (платным) войскам. І вось такіх эфектыўных сіл пад камандаваннем гетманаў было 1000–1500 жаўнераў[6]. Але гэта была гусарыя – конніца, чый росквіт як элітнай кавалерыі прыпаў на другую палову XVI–XVII ст. Гэта была яшчэ не цяжкая латная конніца, якой стала гусарыя ў выніку рэформаў Стэфана Баторыя. Можна меркаваць, што мабільнасць лёгкай кавалерыі і з'явілася адным з фактараў перамогі войскаў ВКЛ.

Колькі ж магло быць ваяроў у шэрагах войска Пятра Шуйскага? Апошнія падлікі расійскіх гісторыкаў паказваюць, што сілы Шуйскага маглі складацца з 5000 ратных людзей і такой самай колькасці «кашавых» (абозных)[7]. У такім разе агульны лік «полацкай» групоўкі мог дасягаць 10 000 чалавек.

---

[1] *Stryjkowski M.* Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiéj Rusi. T. II. S. 414.

[2] *Paprocki B.* Herby rycerstwa polskiego przez Bartosza Paprockiego zebrane i wydane. Kraków, 1858. S. 854.

[3] *Bielski M.* Kronika polska Marcina Bielskiego. Sanok, 1856. T. II, księga IV, V. S. 1153.

[4] *Górnicki Ł.* Dzieje w Koronie Polskiej. Wrocław, 1950. S. 130.

[5] *Янушкевіч А. М.* Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. С. 76.

[6] Там жа. С. 78.

[7] *Пенской В. В.* Русское войско в зимнем походе 1563/1564 гг. и в сражении на р. Ула // Судьбы славянства и эхо Грюнвальда: выбор пути русскими землями и народами Восточ-

Ход бітвы

Такім чынам, аддзелы ВКЛ выправіліся з Лукомля, дзе знаходзілася часовая стаўка гетманаў, на поўнач – насустрач Шуйскаму. У Чашніках да гетманаў дайшлі навіны пра сутычку рот Рыгора Бака і Баркулаба Кордсака з авангардам расійскай групоўкі. Выглядае на тое, што рашэнне пра далейшыя дзеянні было прынята ў Чашніках. Сутнасць гэтага рашэння гетманаў – у імклівай атацы з выкарыстаннем спецыфічных магчымасцей гусарыі.

Далей версіі падзей розняцца – пытанне заключаецца ў ступені падрыхтаванасці расійскага войска да бою. Адразу пасля бітвы Мікалай Радзівіл Руды паведамляў свайму кузену Мікалаю Радзівілу Чорнаму ў Варшаву, што аддзелы Шуйскага першымі стварылі баявы парадак, і маскоўскі ваявода чакаў, пакуль літвінскае войска таксама разгорне свой баявы шэраг. Найвышэйшы гетман рытарычна запытваўся ў лісце да свайго стрыечнага брата: *«З якіх прычын ён [Шуйскі. – А. Д.] выказаў да мяне такую паблажлівасць і якую меў пры гэтым надзею, Ваша Міласць можа сама з усяго сказанага прыхільна заключыць»*[1].

Летапісныя расійскія крыніцы сцвярджаюць адваротнае: расійская ваенная калона не была падрыхтавана да нападу літвінаў. У Дапаўненні да Ніканаўскага летапісу абставіны пачатку бою абмаляваны наступным чынам. Царскім ваяводам выстаўляюцца прэтэнзіі, што *«шли не по государеву наказу, оплошася, не бережно и не полки, и доспехи свои и всякой служебной нарядъ везли въ санехъ»*[2].

Названая акалічнасць, а таксама нечаканасць атакі войска ВКЛ і сталі прычынамі паразы расійскіх аддзелаў. Цяпер гісторыкі, падсумоўваючы розныя звесткі, у сваіх высновах прыходзяць да наступнай карціны бітвы: гэта была атака войска ВКЛ на лагер расійскага войска, якое позна ўвечары стала на начны прывал[3].

У сваю чаргу, нечаканы манеўр войскаў ВКЛ стаў магчымы дзякуючы добра пастаўленай разведцы. Радзівіл, *«маючы навіны і ад слуг, пераважна шпегаў, ведаў, што ў той час у Полацку і ў Маскве дзеялася»*[4]. І вось толькі

ной Европы в Средние века и раннее Новое время (к 600-летию битвы при Грюнвальде/Танненберге) : материалы Междунар. науч. конф. / отв. ред. А. И. Филюшкин. СПб. : Любавич, 2010. С. 237–242.

[1] Копия с письма, присланного литовским гетманом в Варшаву на имя пана Радивила. С. 3.

[2] Летописный сборник, именуемый Патриаршей или Никоновской летописью : продолжение. С. 377.

[3] *Янушкевіч А. М.* Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна. С. 80.

[4] «A mając wiadomości i od sług, przeważnych szpiegów – Wiedział co się wówczas w Połoczku i na Moskwie działo» (Пушкинский Дом. Коллекция Онацевича. X, 33. Л. 17).

ў паэме Стрыйкоўскага мы даведваемся, хто быў інфарматарам вялікага гетмана:

Ведаў калі з кім, калі войска ўжо ісці мае,
Меў пры сабе папа, што ў Полацку бываў,
Які Уліса хітрыкі ўжываў[1].

Як бачым, менавіта праваслаўны святар выкарыстоўваў «хітрыкі Уліса» і быў інфарматарам вялікага гетмана пра падзеі ў занятым маскоўскімі войскамі Полацку.

І гэта была сапраўды параза: у імклівай атацы першыя шэрагі табара маскоўскага войска былі змецены, быў паранены сам палкаводзец – князь Пётр Шуйскі, які мусіў уцякаць. Тут, падобна, і пачалася паніка – шматлікі табар Шуйскага стаў расцякацца па навакольных лясах, пераслед адбываўся праз усю ноч на працягу пяці міль (да 40 км). У гэтым пераследзе маглі быць задзейнічаны драбы літвінскага войска, якія не бралі ўдзелу ў першым наступе (яны папросту не маглі так хутка падысці).

Абставіны гібелі князя Пятра Шуйскага

Паводле тагачасных крыніц добра вядома, што пасля бітвы загінуў і маскоўскі ваявода Полацка князь Пётр Шуйскі. Аляксандр Гваньіні паведамляў, што параненага Шуйскага падчас адступлення забіў сякерай просты селянін[2]. У сваю чаргу аўтар «Гісторыі Лівонскай вайны» (Historia Belli Livonici, 1564) Тылеман Брэдэнбах удакладняе, што труп Шуйскага знайшлі ў студні[3]. Маскоўскія крыніцы, а менавіта «Піскароўскі летапісец», дапаўняюць гэтыя звесткі: *«Князя Петра Шуйского збили с коня, и он с дела пеш утек, и пришел в литовскую деревню, и тут мужики, его ограбя, и в воду посадили»*[4]. Паэма Стрыйкоўскага «Бітва на Уле» дадае некаторыя дэталі гэтай трагічнай гісторыі:

Князь Шуйскі Пётр, з Полацка тых войскаў ваявода,
Пабачыўшы, што неспадзявана прыйшла да яго прыгода,
Сам адзін праз лес уцёк, там каня пазбавіўся, потым
Прыйшоў да селяніна ў футры і ў ланцугу залатым,
Прасіў, каб да Полацка адвёз яго жывым,

[1] Wiedziel kiedy z kim kiedy woisko iuz iscz mialo,
Miał przy sobie Popa czo w Poloczku bywał,
Który Ulissesowych fortelow używał (Пушкинский дом. Л. 16).

[2] *Gwagnini A.* Kronika Sarmacyey Europeyskiey. S. 109.

[3] Гл.: Копия с письма, присланного литовским гетманом в Варшаву на имя пана Радивила. С. 5.

[4] Постниковский, Пискаревский, Московский и Бельский летописцы. М. : Наука. 1978. С. 190 (Полное собрание русских летописей ; т. 34).

Абяцаючы яму дар вялікі з сэрца шчырага.
Селянін вёз яго на санях, а ўбачыўшы клейноты,
Сцяў яго з тылу сякерай, не дбаючы пра яго цноты.
Так той гетман маскоўскі слаўны ў той час загінуў,
Які татараў казанскіх падпарадкаваннем быў слаўны,
А над шведамі ў Інфлянтах быў пераможцам заўжды[1].

Як бачым, палкаводзец ворага можа быць для Стрыйкоўскага і слаўным, і мець свае цноты. Тут цікава будзе даведацца пра рэакцыю Радзівіла, які прыбыў на месца падзеі: *«...узняўшы да неба вочы, плакаў, а сляза за слязой з мокрых вачэй выціскаецца»*[2]. Вялікі гетман запатрабаваў годнага пахавання («slawny pogrzeb») для палеглага ворага, а селяніну,

Які спакушаны быў ланцужком залатым,
Загадаў сцяць галаву, бо мог бы [Шуйскага] прывесці жывога,
Але ў Каіна цнота нічога не значыць...[3]

Такім чынам, учынак селяніна з Полаччыны Радзівіл расцаніў не як гераройства, а як марадзёрства. Трэба адзначыць, што гэтыя звесткі перагукаюцца і з паведамленнямі маскоўскіх крыніц, а менавіта аднаго спецыфічнага летапісу пачатку XVII ст., вядомага пад назвай «Піскароўскі летапісец», які ўжо згадваўся вышэй. Тыя падзеі ў летапісе пададзены наступным чынам:

«Лета 7072-го [1594. – А. Д.] посла царь и государь литовския земли воевати ис Полоцка боярину князю Петру Шуйскому, а и[з] Смоленска двум Серебряным и сходитись им велел на Друцких полях. И воеводы пошли с мест своих, ис Полоцка и и[з] Смоленска. И как будет князь Петр в Ли-

---

[1] Kniaź Soiski Piotr z Połocka tych wojsk wojewoda
Widziąc iż niespodzianie przyszła nań przygoda
Sam jeden przez las uciekł, tam konia zbył, po tym
Przyszedł do chłopa w szubie i w łańcuhu złotym
Prosił by do Połoczka odwiózł go żywego
Ślubując mu dar wielki s Serca prawdziwego
Chłop wioząc go na saniach, a widząc klejnoty
Ciął go z tyłu siekierą, nie dbał jego cnoty.
Tak ten Hetman Moskiewski sławny w ten czas zginął,
Który kazańskich Tatar zhołdowaniem słynął,
A nad Szwedy w Liflanty był zwycięzcą zawżdy (Пушкинский дом. Л. 29).

[2] "...wzniowszy w nebo oczy,
Płakał, a śloze za ślozą mokrych źrenic tłoczy" (Пушкинский дом. Л. 30).

[3] Który ułakomiony był łańcuchem złotym,
Kazał ściąć, bowiem by byl mogl przywiesć żywego
Lecz u Kaina cnota nie waży... (Пушкинский дом. Л. 31).

товской земле, в деревне в Овлялицех, и тут пришли безвестно литовския люди многия, воевод побили и поймали многих дворян, семьсот человек больших дворян и детей боярских имянных. А князя Петра Шуйского збили с коня, и он з дела пеш утек и пришол в литовскую деревню; и тут мужики его ограбя и в воду посадили. И сведал виленской воевода и тех мужиков велел переимати и казнити, а тело выняти, и погребе чесно в Вильне в Стонис[л]аве в римской церкви. И сам за ним шел и погреб возле великого князя дочери Елены, коя была за Олександром, королем литовским»[1].

Каб правесці больш адэкватны аналіз гэтага паведамлення, трэба ўзяць пад увагу палітыка-ідэалагічную скіраванасць «Піскароўскага летапісца». Названы наратыўны помнік быў створаны, найбольш верагодна, у 20–30-х гадах XVII ст. і змяшчаў звесткі ад пачаткаў Русі і гісторыі Расіі да 1615 г. Па сваім складзе «Піскароўскі летапісец» – кампіляцыя з розных летапісаў, афіцыйных дакументаў, легенд, асабістых успамінаў аўтараў. Галоўная ж місія летапісца – пазітыўная рэпрэзентацыя цара Васіля Шуйскага (1606–1610) і, адпаведна, усяго яго роду. Наадварот, цар Іван IV пададзены ў «Піскароўскім летапісцу» ў негатыўным ракурсе. Пра XVI – пачатак XVII ст. «Піскароўскі летапісец» утрымлівае часам унікальныя звесткі – відавочна, яны ўзяты з незахаваных крыніц і вусных паведамленняў, адрэдагаваных у адпаведным тэндэнцыйным ключы. Можна сцвярджаць, што гэты летапісец выйшаў з асяроддзя нерадавітых людзей, блізкіх да Шуйскіх. А Васілія Шуйскага «выкрыкнулі» на царства «пірожнікі і шубнікі». Даследчык рускіх летапісаў Міхаіл Ціхаміраў нават характарызаваў «Піскароўскі летапісец» як «своеасаблівы памфлет пачатку XVII ст.»[2]

Але адкуль стваральнік «Піскароўскага летапісца» браў звесткі пра гібель Пятра Шуйскага? Тэксталагічны аналіз паказвае, што паміж творамі Мацея Стрыйкоўскага і «Піскароўскім летапісцам» няма непасрэдных перасячэнняў і запазычанняў. Відавочна, у стваральніка «Піскароўскага летапісца» былі свае крыніцы, якія не супадалі з крыніцамі Стрыйкоўскага. Адсюль, дарэчы, вынікаюць і некаторыя фактычныя памылкі «Піскароўскага летапісца». Так, напрыклад, аўтар летапісца адзначае, што Пётр Шуйскі быў пахаваны ў «рымскай царкве», побач з вялікай княгіняй літоўскай Аленай Іванаўнай, жонкай караля і вялікага князя Аляксандра. Лічыцца, што вялікая княгіня Алена была пахавана ў праваслаўнай Прачысценскай царкве (саборы Прачыстай Багародзіцы) – менавіта гэты сабор на працягу 1511–1522 гг. адбудоўваў пераможца бітвы пад Оршай князь Канстанцін Астрожскі[3]. Вялікая

[1] Постниковский, Пискаревский, Московский и Бельский летописцы. С. 190.

[2] *Тихомиров М. Н.* Русское летописание. М. : Наука, 1979. С. 247.

[3] Гл.: Виленский Успенский собор, называемый Пречистенским и Митрополительным // Памятники русской старины в западных губерниях, издаваемые с высочайшего соизволения П. Н. Батюшковым. СПб. : [М-во внутр. дел], 1872. Вып. 5. С. 89–90;

княгіня памерла ў 1513 г., і, верагодна, яе пахаванне ў Прачысценскай царкве магло адбыцца пасля заканчэння асноўнага этапу рэканструкцыі будынка.

Існуе адна верагоднасць слушнасці пададзенай у «Піскароўскім летапісцы» інфармацыі. Ад 1609 г. Прачысценская царква стала ўніяцкай (грэка-каталіцкай) – адбылася гэта змена статусу якраз у час складання «Піскароўскага летапісца». Адкрытым застаецца пытанне, наколькі аператыўна маглі звесткі з Вільні трапляць да аўтара-«летапісца».

Даследчык «Піскароўскага летапісца» М. Ціхаміраў у сувязі з паведамленнямі ў ім пра гібель князя Шуйскага і рэакцыю гетмана Радзівіла выказваў меркаванне – ці не была прайграная літвінам бітва вынікам спроб Пятра Шуйскага ўзяць прыклад з Курбскага і перайсці на бок Вялікага Княства Літоўскага?[1] Князь Андрэй Шуйскі пакінуў маскоўскі стан у красавіку 1564 г., ужо пасля бітвы пад Улай. Няма ніякіх падстаў падазраваць Шуйскага ў таемных зносінах з уладамі ВКЛ. Відавочна, што такіх поглядаў прытрымліваўся і цар Іван IV, вядомы сваім недаверам да ўласных падданых. У 1568–1569 гг. паводле просьбы сыноў Пятра Шуйскага Івана і Мікіты пагадзіўся на абмен цела памерлай у маскоўскім палоне жонкі полацкага ваяводы Станіслава Давойны Петранелі (з Радзівілаў). Але гэты абмен не адбыўся – пасланцы Шуйскіх вярнуліся ў Маскву без вынікаў[2].

Але ўсё ж застаецца пытанне, чаму Мікалай Радзівіл Руды так востра адрэагаваў на выпадак гібелі свайго праціўніка – маскоўскага ваяводы Пятра Шуйскага. Наколькі сам факт марадзёрства меў тут вырашальнае значэнне?

Ідэя дамоўленасці паміж маскоўскім і літвінскім палкаводцамі ніяк не абгрунтоўваецца іншымі крыніцамі. Ды і абставіны бітвы (імклівы і нечаканы яе характар) не пацвярджаюць такой схемы паводзін. Да таго ж прыгадаем, што параненаму Шуйскаму ўсё ж прыйшлося ўцякаць з поля бітвы – ён не здаўся пераможцам, што супярэчыць верагоднасці папярэдняй дамовы.

Паводле аналогіі з аршанскім трыумфам 1514 г., калі ў палон трапілі 6 «вялікіх ваявод» маскоўскага войска на чале з Іванам Чаляднінім, Мікалаю Радзівілу Рудому і Рыгору Хадкевічу і гэтым разам варта было спадзявацца на ганаровы палон маскоўскіх ваявод – гэта павялічыла б палітычнае гучанне самой перамогі і яшчэ больш уславіла трыумфатараў. Паланёныя

Щербицкий О. В. Виленский Пречистенский собор: (Исторический очерк в связи с церковно-религиозной жизнью г. Вильны). Вильня : Тип. «Рус. Почин», 1908. 82, [1] с.; *Соболевский И. В.* Пречистенский собор в Вильне. Вильна, 1904; *Янкевичене А. С.* Некоторые сооружения Вильнюса XVI в. // Архитектурное наследство. М., 1964. Вып. 17.

[1] *Тихомиров М. Н.* Русское летописание. С. 242.

[2] *Солодкин Я. Г.* Князь П. И. Шуйский – герой и неудачник Ливонской войны // Балтийский вопрос в конце XV–XVI в. : сб. науч. ст. / под ред. А. И. Филюшкина. М. : Квадрига, 2010. С. 273.

арыстакраты заўжды ў Сярэднявеччы і раннім Новым часе былі аб'ектамі палітычных і фінансавых перамоў. Учынак беларускага селяніна перакрэсліў падобныя планы.

Але, падобна, магла існаваць яшчэ адна важная прычына вострай рэакцыі найвышэйшага гетмана ВКЛ – сацыяльна-іерархічная. Князь Шуйскі загінуў не на самім полі бітвы, а падчас уцёкаў. Учынак ваяра, які б нанёс смяротны ўдар маскоўскаму ваяводу непасрэдна ў гарачыні бітвы, мог расцэньвацца як геройскі. А тут мы маем выпадак нападу селяніна на маскоўскага арыстакрата. Паводле канонаў барочнага пісьменства рэакцыя Мікалая Радзівіла Рудога паказана вельмі эмацыйна і нават сентыментальна, што літаратурнымі формамі падкрэслівае прыналежнасць і Радзівіла, і Шуйскага да супастаўных (найвышэйшых) пластоў сваіх дзяржаў. Не справай селяніна было ўмешвацца ў гэты іерархічны расклад. Нават жорсткая вайна не да канца здымала выразныя сацыяльныя межы.

Наступствы бітвы

Дыскусіі пра колькасць войскаў, якія ўдзельнічалі ў бітве з абодвух бакоў, яшчэ не сціхлі, як спрэчнымі застаюцца і абставіны бітвы. Але пра наступствы бітвы можна сказаць больш пэўна. Найперш, быў сарваны паход расійскіх войскаў у глыб тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага: атрымаўшы паведамленні пра наступствы бітвы пад Улай, Сярэбраныя спынілі свой далейшы рух на захад і вярнуліся ў межы Расійскай дзяржавы.

Апроч таго, саноўнікі ВКЛ паспрабавалі атрымаць ад гэтай перамогі дадатковыя як унутры-, так і знешнепалітычныя дывідэнды. Тут трэба адзначыць, што ў студзені 1564 г. канцлер і ваявода віленскі Мікалай Радзівіл Чорны знаходзіўся ў Варшаве, дзе на каронным (польскім) сойме адбываліся перамовы пра унію паміж Каронай і Вялікім Княствам. 3 лютага 1564 г. ліст найвышэйшага гетмана Мікалая Радзівіла Рудога пра перамогу дайшоў да яго кузена. Пасля дэмаралізацыйнага падзення Полацка ў 1563 г. весткі пра перамогу пад Улай умацавалі пазіцыі дэлегацыі ВКЛ, і гэта дало магчымасць канцлеру на той момант перапыніць унійны працэс. Сам канцлер выехаў у Вялікае Княства.

Таксама ў Заходняй Еўропе была праведзена досыць удалая інфармацыйна-прапагандысцкая кампанія. Падобна, што спрыяннем сына Радзівіла Чорнага – Крыштафа «Сіроткі», які ў той час навучаўся ў Страсбургу, – тэкст рэляцыі Радзівіла Рудога быў перакладзены на нямецкую мову і выдадзены ў выглядзе «лятучай газеты»[1].

---

[1] *Ragauskienė R.* 1564 m. Ulos kautynės: įvykio tikimybės // Istorijos akiračiai. Vilnius : Lietuvos istorijos institutas, 2004. P. 155–176.

Высновы

На базе паведамленняў наратыўных крыніц дыскусія пра колькасны склад удзельнікаў бітвы на Уле 1564 г. не вырашаецца пазітыўна. Але дазваляльна сцвярджаць, што пададзеныя ў паведамленнях саноўнікаў і гістарыёграфаў ВКЛ маштабы корпуса Пятра Шуйскага могуць быць завышаны ў 3 разы. Паводле найноўшых даследаванняў, колькасць гэтага войска дасягала 10 000 чалавек. Пры невядомасці колькаснага складу войска ВКЛ можна меркаваць, што яно было меншым за корпус Шуйскага, пра што сцвярджаюць крыніцы ВКЛ. Тагачасныя расійскія крыніцы гэтую тэму не разглядалі. Абставіны бітвы таксама застаюцца дыскусійнымі, але пэўна можна казаць пра ўдалы тактычны манеўр гетманаў ВКЛ, калі іх войска здзейсніла франтальную атаку на копрпус Шуйскага, які знаходзіўся, верагодна, у стадыі падрыхтоўкі да стаянкі ў начным лагеры. Безумоўнай перавагай камандавання войска ВКЛ была наладжаная разведка ў Полацку. Паводле Стрыйкоўскага, інфармантам у Полацку быў мясцовы праваслаўны святар. Апроч таго, варта адзначыць удалую агітацыйную кампанію, якую правялі па выніках бітвы Радзівілы і іх прадстаўнікі ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе. Гэта акцыя дазволіла адцягнуць заключэнне дзяржаўнай уніі паміж ВКЛ і Каронай Польскай, праціўнікамі якой былі Радзівілы. Гэтыя палітычныя абставіны варта мець на ўвазе пры аналізе тагачасных наратыўных крыніц.

Марат Клімаў *(Мінск)*

АРХЕАЛАГІЧНЫЯ І ЛАНДШАФТНА-КЛІМАТЫЧНЫЯ ПАДСТАВЫ ДЛЯ ЛАКАЛІЗАЦЫІ БІТВЫ ПАД УЛАЙ

Адносна месцаў бітваў сярод навукоўцаў існуюць два асноўныя напрамкі даследаў. Першы з іх – лакалізацыя дакладнага месца бітвы і прывязка яе да мясцовасці. Другі напрамак – удакладненне не месца, якое вядома, а паслядоўнасці і падрабязнасцей падзей. Другі з напрамкаў добра вядомы беларускім даследчыкам па падзеях 1812 г. і паспяхова рэалізоўваецца ў працах В. І. Кошмана[1]. Падзеі 1812 г. выдатна задакументаваны і маюць істотную артэфактную базу, сярод якой, безумоўна, шрапнель і кулі, коль-

[1] *Кошман В. И.* Археология полей сражений: уникальные предметы вооружения на месте переправы армии Напалеона через р. Березину в ноябре 1812 г. // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. арт. VI Міжнар. навук. канф., Полацк, 28–29 крас. 2022 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. А. І. Корсак (адк. рэд.), У. Я Аўсейчыка. Наваполацк : Полацкі дзярж. ун-т імя Ефрасінні Полацкай, 2023. С. 61–69.

Навуковае выданне

Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі

ЧАШНІЦКІ КРАЙ:
ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА РЭГІЁНА

Зборнік навуковых артыкулаў

Укладальнік
Бараноўскі Аляксандр Віктаравіч

Рэдактар *М. І. Рэменіца*
Мастацкі рэдактар *І. Т. Махнач*
Тэхнічны рэдактар *В. А. Ткачова*
Камп'ютарная вёрстка *Л. І. Кудзерка*

Падпісана да друку 16.03.2026. Фармат 70×100 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 41,6. Ул.-выд. арк. 33,3. Тыраж 300 экз. Заказ 45.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука».
Пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/18 от 02.08.2013, № 2/196 от 05.04.2017.
Вул. Ф. Скарыны, 40, 220084, г. Мінск.

ISBN 978-985-08-3400-3